СУСТРЭЧЫ




# «ВЫХАД У СВЕТ» ПА-САЮЗНАМУ

**ЛІДА. Апошняя ў 2024 годзе літаратурная гасцёўня «Выхад у свет» у краме «Книжный мир» традыцыйна сабрала літаратараў, аматараў мастацкага слова і стала выдатным падарункам для ўсіх, хто яе наведаў. На фінішы года дадзены старт цыклу сустрэч з членамі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

21 снежня перад лідчанамі выступілі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, пераможцы Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча – паэтэса, публіцыст Тамара Мазур і паэтэса, празаік, публіцыст Таццяна Лашук. Прадставіў калег гродзенскі рэзідэнт літаратунай гасцёўні, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. Дата мерапрыемства супала з 19-й гадавінай утварэння Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ.

Паміж лідскімі і гродзенскімі пісьменнікамі ўсталяваліся цёплыя сяброўскія ўзаемаадносіны. Апошнім часам тут паспелі прадэманстраваць сваю творчасць нямала цікавых, таленавітых гасцей з абласнога цэнтра. Створаную лідскімі паэтамі Русланам і Святланай Піваваравымі пляцоўку для творчых сустрэч пісьменнікаў і чытачоў у чарговы раз наведаў кіраўнік Лідскага раённага літаратурнага аб’яднання «Суквецце», паэт Уладзімір Глінін. Нагадаем, што на сённяшні дзень кнігарня «Книжный мир» у цэнтры Ліды – адзінае ў Гродзенскай вобласці прадпрыемства гандлю, на базе якога праходзяць літаратурныя сустрэчы.



У кастрычніку 2024 года адзін з заснавальнікаў літгасцёўні, вядучы сустрэч, лідскі паэт Руслан Півавараў быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Гэтая акалічнасць стала адной з прычын, якімі тлумачыцца рашэнне даць старт цыклу сустрэч з прадстаўнікамі Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Пачалі з запрашэння ў літгасцёўню пераможцаў сёлетняга абласнога конкурсу рукапісаў, якому арганізатарамі – упраўленнем культуры Гродзенскага аблвыканкама прысвоена імя «песняра чыстае красы» Максіма Багдановіча.



Адыходзячы год быў юбілейным і даволі плённым для Тамары Мазур (*на фота*). Пабачылі свет адразу тры новыя кнігі Тамары Міхайлаўны: «Стихия стихотворения» і «Васількі на світанні». А нараджэннем кнігі для дзяцей «Алфавітныя прыпынкі дзяўчынкі Літарынкі» паэтэса абавязана перамозе ў абласным конкурсе рукапісаў (намінацыя «Дзіцячая літаратура»). Тамара Мазур – вядомы ў рэспубліцы журналіст, стаяла ля вытокаў цэлага шэрагу рэспубліканскіх перыядычных выданняў, шмат гадоў аддала працы ў рэгіянальных газетах. Слова стала для паэткі справай усяго жыцця. Выступленне нашай калегі па СПБ змясціла экскурс у біяграфію і творчую лабараторыю пісьменніцы, цікавы аповяд пра рэалізацыю яе творчых задум на дадзеным этапе, пра яе філасофію жыцця ў літаратуры. Аўтар кніг пазнаёміла слухачоў з іх ідэйным зместам. І вядома, прагучала паэзія Тамары Міхайлаўны на сакавітай беларускай мове, а таксама ў перакладзе на рускую. Наша калега з асалодай цытавала сваіх любімых беларускіх паэтаў – Максіма Багдановіча і Яўгенію Янішчыц. Выступленне члена СПБ, паэтэсы, публіцыста Тамары Міхайлаўны Мазур у снежаньскай літаратурнай гасцёўні лідскімі аднадумцамі было ўспрынята «на ўра». Можна не сумнявацца ў тым, што творчая сустрэча ў Лідзе для гэтага аўтара далёка не апошняя. Зусім наадварот, – пакладзены пачатак сапраўднаму трываламу сяброўству.





Таццяна Лашук (*на фота*) нарадзілася ў Лідзе. Член СПБ, пісьменніца-педагог перамагла ў намінацыі «Проза» Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча, але сваё выступленне пачала з верша. Ураджэнка Ліды падарыла светлае лірычнае прысвячэнне свайму роднаму гораду, яго жыхарам і багатай на падзеі гісторыі. Менавіта гістарычная навука прывяла педагога, настаўніцу гродзенскай гімназіі № 3 імя Вольгі Соламавай Таццяну Ігараўну Лашук на пісьменніцкую сцяжыну. Творца пазнаёміла аўдыторыю са спектрам сваіх інтарэсаў і тэматычным дыяпазонам творчасці, пералічыла некаторыя свае публікацыі і дасягненні, галоўным з якіх, напэўна, можна назваць перамогу ў галоўным літаратурным спаборніцтве Прынёмання, хаця ў багажы пісьменніцы маюцца ўзнагароды рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Таксама адбылася прэзентацыя кніг Таццяны Лашук, у тым ліку, зборніка гістарычнай прозы «Конфетти», рукапіс якога стаў пераможным. Выступленне члена СПБ Таццяны Лашук сустрэла шчырую зацікаўленасць і нават справакавала цікавую гістарычна-культуралагічную дыскусію. Сапраўдным арыгінальным перфомансам стала дэкламацыя паэткай аўтарскай нізкі твораў з абласнога альманаху «На Нёманскай хвалі» ў старажытнай жанравай форме ўсходняй паэзіі – хоку.



На гэты раз многае было па-новаму, упершыню. Так, упершыню сярод гасцей толькі члены СПБ. Упершыню ў кніжным магазіне ў цэнтры Ліды выступілі прадстаўнікі некалькіх раёнаў Прынёмання, ураджэнцы Ліды і Ваўкавышчыны. Менавіта на Ваўкавышчыне нарадзілася Тамара Мазур, якая сёння прадстаўляе горад-спадарожнік Скідзель (Гродзенскі раён), дзе пастаянна жыве, і горад Масты, у якім вельмі часта бывае і праводзіць шмат часу. Атрымаўся свайго роду міні-фестываль рэгіянальнай літаратуры. Снежаньскае выступленне членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі ў Лідзе выклікала яркія ўражанні ў мясцовых знатакоў мастацкага слова. Каб гэта не выглядала нясціплай самарэкламай, дазвольце прывесці водгук, які пакінула ў

інтэрнэт-супольнасці «Чертог поэта» ўдзельніца сустрэчы, педагог-філолаг з Ліды Вольга Высоцкая (*на фота*):



Вольга Высоцкая

Хочу поделиться впечатлениями от незабываемой встречи с новыми для меня поэтами Гродненщины. Тамара Мазур с первых же мгновений своего эмоционального, яркого выступления отправилась вместе со зрителями в мир белорусской поэзии, необыкновенно интересный, познавательный, воодушевляющий! Настолько непосредственным, самобытным, глубоко профессиональным был рассказ о себе и своём творчестве. За небольшой промежуток времени мы успели погрузиться в глубины поэзии, узнали об особенностях стихов для детей, раскрыли новые формы двух-, трёх, четырёхстрофных стихов... Чувствовалось, что Тамара – неиссякаемый источник задумок, идей, планов!

Выступление Татьяны Лашук, молодого, обаятельного прозаика, поэта, публициста, тронуло, вызвало бурю эмоций и глубокое уважение и от рассказа о своей литературной деятельности, и от философских хокку, над которыми хочется поразмышлять, и от патриотических стихов о Лиде, и от того, как достойно держится эта милая молодая женщина. Хорошее образование, прекрасное воспитание, трудолюбие, интерес и любовь к тому, чем занимается Татьяна, невозможно было скрыть. Это было талантливо, высокопрофессионально, очень интересно.

Спасибо огромное Дмитрию Радиончику за новых для нас представителей Союза писателей Беларуси. Вами, действительно, может гордиться страна. Вы – белорусская элита. Так держать! Аплодирую. Руслану и Светлане – благодарность от всех зрителей и слушателей за отлично подготовленную встречу. Мы вас любим!

І мы таксама вельмі палюбілі выступаць тут. Чаму? Адказам можа паслужыць прыведзены вышэй водгук. Шчырая чалавечая дабрыня, сардэчная цеплыня, увага і павага з боку гаспадароў і арганізатараў сустрэч да ўсіх без выключэння гасцей сталі адметнымі рысамі літаратурных сустрэч у Лідзе. Прыемна, што снежаньскую літаратурную гасцёўню «Выхад у свет» наведалі родныя і бацькі Таццяны Лашук. Ініцыятары праекта Руслан і Святлана Піваваравы падарылі кветкі пісьменніцам.



Працягнулі працу літаратурнай гасцёўні гаспадары, літаратары і аматары мастацкага слова з Ліды:  Уладзімір Глінін, Васіль Гаргуль, Людміла Русь, Ніна Кобец, Таццяна Цярэня, Вольга Высоцкая, Алена Несцерава, Руслан і Святлана Піваваравы. Тэмы выступленняў адлюстроўвалі душэўны настрой людзей, у якім змяшаліся чаканне навагодніх цудаў, набліжэнне зімовых святаў і трывога за лёс Айчыны ў неспакойным свеце, любоў да роднай зямлі і гарманічная інтэграванасць беларускай культуры ў сусветную культурную спадчыну. Гучалі імёны Францыска Скарыны, Аляксандра Пушкіна, іншых славутых творцаў. Хвілінай маўчання прысутныя ўспомнілі таленавітага лідскага паэта, былога кіраўніка раённага літаб'яднання «Суквецце» Аляксандра Мацулевіча, які нечакана, заўчасна пайшоў з жыцця год таму. Гаспадары выказвалі свае думкі пра творчасць гасцей, дзяліліся сваімі поглядамі на мастацтва і жыццё. Як заўсёды, прагучалі планы на бліжэйшую будучыню і анонсы некаторых літаратурных падзей. Было сказана і пра грандыёзнае свята – Дзень беларускага пісьменства, мерапрыемствы якога Ліда будзе прымаць у 2025 годзе.

Снежаньская сустрэча ў літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» (г. Ліда, крама «Книжный мир») з удзелам членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі прайшла сапраўды па-саюзнаму. Атмасфера сустрэчы нагадала адчуванне дружнай сям'і, дзе для кожнага знойдзецца порцыя ўвагі, душэўнага цяпла, добрае слова, светлая думка. Калі мы вымаўляем слова «саюз» у назве нашай арганізацыі, усё часцей маецца на ўвазе адзінства людзей, згуртаваных вакол ідэі стваральнай працы, чалавечнасць, якую нічым не замяніць.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ




**На фота:** Кніжная крама «Книжный мир». Ліда (Гродзенская вобласць), 21 снежня 2024 года. Апошняя ў адыходзячым годзе літаратурная гасцёўня «Выхад у свет» прайшла з удзелам членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі, пераможцаў Абласнога літаратурнага конкурсу рукапісаў імя Максіма Багдановіча Тамары Мазур і Таццяны Лашук.




Працу літаратурнай гасцёўні пачынае вядучы сустрэчы, паэт Руслан Піваравараў




Сваіх калег прадставіў член СПБ, паэт, публіцыст, літаратурны крытык Дзмітрый Радзівончык (Гродна)







Выступае член СПБ, паэтэса, публіцыст Тамара Мазур


КОРНЕЙ ЧУКОВСКИЙ
МОЙДОДЫР


ЗАМЕЖНАЯ
ТАМАРА МАЗУР


КОНФЕТТИ


сучасная
проза
замежная
літаратура
100 голосов
Маша и медведь


Дракоша Кара


Выступае член СПБ, паэтэса, празаік, публіцыст Таццяна Лашук









ратура для дзяцей
ОВЫМ ГОДОМ
И РОЖДЕСТВОМ!




Выступае ініцыятар літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет», паэтэса Святлана Піваварава (Ліда)






Кіраўнік Лідскага раённага літаб'яднання «Суквецце», паэт Уладзімір Глінін



Стваральнік першай у Лідзе літаратурнай гасцёўні, ветэран педагагічнай працы, паэт-аматар Васіль Гаргуль




Людміла Русь



Валерый Мацулевіч



Ніна Кобец




Ветэран педагагічнай працы Таццяна Цярэня






Члены СПБ, паэты Дзмітрый Радзівончык (Гродна) і Руслан Піваварaў (Ліда)






Класіка






Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, гісторык Таццяна Лашук са сваімі роднымі



Чытач, педагог Вольга Высоцкая і паэтэса Алена Несцерава (стаяць)












**Фота** Руслана і Святланы Піваваравых